## 28 ліпеня 2023 года - 85 гадоў з дня нараджэння ЛЬВА РАМАНАВІЧА КАЗЛОВА (1938, в. Літвінкі, Кобрынскі раён), вучонага-гісторыка, даследчыка ў галіне гістарычнай геаграфіі і картаграфіі Беларусі, пісьменніка, выдаўца

**Леў Раманавіч Казлоў** нарадзіўся 28 ліпеня 1938 года ў в. Літвінкі Кобрынскага павета Палескага ваяводства (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Вялікая Айчынная вайна застала сям'ю (маці Марыя Іванаўна, бацька Раман Іванавіч і трохгадовы Лёва) у Пінску. Пасля вайны пераехалі ў Кобрын. У школу (сёння СШ № 1) Леў пайшоў у 1946 годзе і правучыўся там сем гадоў. Далей працягваў вучобу ў сярэдняй школе № 2, якую закончыў у 1956 годзе. У школьныя гады любіў чытаць, выяўляў здольнасці да малявання, захапляўся гісторыяй.



У 1957-1960 гадах Леў Казлоў служыў у Савецкай арміі. Маляваў сценгазеты, але часцей яго выкарыстоўвалі як ваеннага картографа.

Марыў стаць мастаком, аднак у сілу пэўных абставінаў пасля службы ў арміі замест мастацкага вучылішча паступае на гісторыка-геаграфічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Геаграфія і гісторыя – тыя прадметы, якія таксама цікавілі яго. У інстытуце паглыбіўся ў вывучэнне старажытнай картаграфіі.

У 1965 годзе закончыў інстытут, затым там жа навучаўся ў аспірантуры (1965–1968), працаваў выкладчыкам. У 1970 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Рост культурна-тэхнічнага ўзроўню рабочага класа Беларусі ў гады першай пяцігодкі (1928–1932 гг.)», атрымаў навуковую ступень кандыдата гістарычных навук.

У 1970–1981 гадах – старшы выкладчык, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі МДПІ імя А. М. Горкага. У 1981–1992 гадах – прафесар кафедры гісторыі Беларусі і замежных краін, дэкан факультэта замежных студэнтаў Мінскага інстытута культуры. З 1992 па 1994 год – старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных дысцыплін, кіраўнік картаграфічнай групы Інстытута гісторыі АН Беларусі. Л. Р. Казлоў узначальваў групу, якая стала працаваць над пяцітомным

«Вялікім гістарычным атласам», арганізаваў работу па складанні новых гістарычных карт і школьных атласаў.

У 1994 годзе Л. Р. Казлоў, не дачакаўшыся бюджэтнага фінансавання выдання карт, заснаваў і ўзначаліў прыватнае выдавецтва – УП «Арты-Фэкс», якое займаецца выданнем геаграфічных карт і атласаў. Работа выдавецтва «Арты-Фэкс» адзначана еўрапейскім залатым прызам «Europe Award» (Парыж, 2001).

З 1995 года Л. Р. Казлоў – галоўны рэдактар «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі», часопісаў «Падарожнік» (1997–2001), «Наш край». Навуковы кансультант выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі», член Саюза прадпрымальнікаў Беларусі, Нацыянальнай Геаграфічнай Асацыяцыі (ЗША), міжнароднага «Клуба лідэраў гандлю». Адзначаны еўрапейскім прызам «За якасць» (Парыж, 2002).

Аўтар кніг «Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны» (1980), «Беларусь на сямі рубяжах» (1993), «Картаграфія Беларусі падчас паўстання 1863-1864 гг.» (2003), «Беларусь у працах польскіх картографаў» (2004), «Беларускае Палессе на старажытных картах» (2006) і інш. Удзельнік шэрагу міжнародных і рэгіянальных навуковых канферэнцый, аўтар артыкулаў па краязнаўчай і картаграфічнай тэматыцы.

Большую частку свайго жыцця Л. Р. Казлоў займаецца ўзнаўленнем рарытэтных карт, якія адшуквае ў розных архівах, бібліятэках, на аўкцыёнах і ў прыватных калекцыянераў. Дзякуючы дзейнасці Льва Раманавіча айчынныя музейныя экспазіцыі папоўніліся дзясяткамі новых выяў беларускіх зямель з маршрутамі старажытных часоў, якія раней не дэманстраваліся. Некаторыя карты, намаляваныя ім, упрыгожваюць раённыя краязнаўчыя музеі.

Над экзэмплярам узноўленай карты для Нясвіжскага замка Леў Раманавіч працаваў каля месяца і ствараў яго з арыгінала, які захоўваецца ў старажытным шведскім г. Упсала. У музеі Нясвіжскага замка экспануецца і другі твор вучонага – вялікі глобус XVI стагоддзя. У картаграфічным кабінеце Музея гісторыі Мінска большасць экспанатаў выкананы рукамі Льва Раманавіча. Нягледзячы на век камп’ютарных тэхналогій, ён працуе ў старадаўняй манеры, не здраджвае звычайнаму алоўку, цыркулю, пяру, акварэлям. Калегі ахрысцілі Льва Раманавіча беларускім Меркатарам (у гонар фламандскага картографа і географа XVI ст. Г. Меркатара). Л. Р. Казлоў

упэўнены, што карты могуць расказаць нават больш, чым летапісы, гістарычныя дакументы.

Краязнаўствам Леў Раманавіч займаецца з 1955 года. Настаўнікамі лічыць М. Улашчыка, М. Гнеўку, Г. КахаНоўскага, М. Ткачова. У суаўтарстве з дырэктарам Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава Нінай Пліско да 700-годдзя Кобрына выдаў гісторыка-эканамічны нарыс «Кобрин» (1987). У якасці рэдактара-укладальніка Л. Р. Казлоў працаваў над гісторыка-дакументальнай хронікай «Памяць. Кобрынскі раён» (2002).

Чалавек рознабаковага таленту, энцыклапедычных ведаў, асоба неардынарная, з самаіроніяй і пачуццём тонкага гумару. Як многія з гісторыкаў – нумізмат, сабраў вялікую калекцыю манет, захапляецца гістарычнай мастацкай літаратурай, мае выдатную бібліятэку. У 1983 годзе выйшаў яго зборнік гістарычных анекдотаў «Музей остроумия», які быў двойчы перавыдадзены (1986, 1989), у 1999 годзе з’явілася новае дапоўненае выданне – «Большой музей остроумия». Аўтар мастацкіх кніг «Радзивилл Сиротка» (2015), «З дазволу караля і вялікага князя» (1992, 1998, 2016) і інш. Пад псеўданімам «Плат. Гудовіч» выдаў зборнік вершаў «Размова нанова» (2017).

У ліпені-жніўні 2018 года ў зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працавала выстава «Вандроўкі па ваколіцах мінулага», прысвечаная 80-годдзю Л. Р. Казлова. З 14 верасня юбілейная выстава дзейнічала ў Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы, дзе адбылася творчая сустрэча з юбілярам. Усе прадстаўленыя на выстаўцы матэрыялы Леў Раманавіч падараваў кобрынскай бібліятэцы і яе чытачам, за што бібліятэкары вельмі ўдзячны знакамітаму земляку. Наогул, у фондзе бібліятэкі шмат кніг з паметкай «З асабістай бібліятэкі Л. Р. Казлова».

У маі 2023 года ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна ўрачыста адкрылася выстаўка «Мастацтва старажытнай картаграфіі», у якой увасобіўся плён апантанай працы па зборы старажытных карт Л. Р. Казлова. У ліпені ў краязнаўчым інфармацыйным цэнтры кобрынскай бібліятэкі праходзіць юбілейная выстаўка-партрэт «Гісторык, картограф, літаратар».

Нягледзячы на тое, што наш зямляк даўно ўжо жыве ў Мінску, малую радзіму ён не забывае. Як заўважае Леў Раманавіч, дакрананне да вытокаў наталяе яго новымі свежымі

ідэямі і энергіяй, таму, нягледзячы на сталы ўзрост, ён штогод прыязджае на Кобрыншчыну — пакланіцца магілам сваіх бацькоў, паразмаўляць з землякамі, падыхаць паветрам далёкага дзяцінства, зазірнуць у кобрынскія школы, музей, бібліятэку.

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2018 г., дапоўнены ў 2023 г.*
*Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.*
*Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф І катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

***Працы Л. Р. Казлова***


**Гістарычны** атлас Беларусі : навукова-папулярнае ілюстраванае выданне / гал. рэд. і ўклад. Л. Р. Казлоў. – Мінск : «Арты-Фэкс», 2001. – 30, [1] с.

**Гудовіч, П.** Размова нанова : выбраныя вершы / Плат. Гудовіч. – Мінск : Галіяфы, 2017. – 48 с.

**Казлоў, Л. Р.** «Афіцына Блавіяна»: з сярэднявечча - у новы час / Л. Р. Казлоў. - Мінск : [б. в.], 2014. - 16 с.

**Казлоў, Л. Р.** Беларускае Палессе на старажытных картах : [навукова-папулярны нарыс] / Л. Р. Казлоў. - Мінск : Арты-Фэкс, 2006. - 63, [1] с.

**Казлоў, Л. Р.** Беларусь на сямі рубяжах (XI – пачатак XX ст.) / Л. Р. Казлоў. – Мінск : УП Арты-Фэкс, 2000. – 57, [2] с. : карт.

**Казлоў, Л. Р.** Беларусь на сямі рубяжах (XI - пач. XX стст.) / Л. Р. Казлоў. - Мінск : ВКП «Арты-Фэкс», 1998. - 35 с. : карт.

**Казлоў, Л. Р.** Беларусь на сямі рубяжах / Л. Р. Казлоў. - Мінск : Беларусь, 1993. - 71 с. : карт.

**Казлоў, Л. Р.** Беларусь у працах польскіх картографаў (XVI - XX стст.) / Л. Р. Казлоў. - Мінск : Арты-Фэкс, 2004. - 115, [2] с. - (Беларусь на старажытных картах).

**Казлоў, Л. Р.** Гісторыя старажытнай картаграфіі Беларусі ў выданнях УП «Арты-Фэкс» / Л. Р. Казлоў // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. : [у 2 ч.] / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. - Мінск, 2006. - Ч. 2. - С. 123–125.

**Казлоў, Л. Р.** З дазволу караля і вялікага князя / Л. Р. Казлоў. – Мінск : Галіяфы, 2016. – 159 с. : іл.

**Казлоў, Л. Р.** З дазволу караля і вялікага князя / Леў Раманавіч Казлоў ; прадм. У. Някляева. - Мінск : Арты-Фэкс, 1998. - 109, [3] с. - (Lectori salutem).

**Казлоў, Л. Р**. З дазволу караля і вялікага князя : [зборнік гістарычных анекдотаў] / Леў Раманавіч Казлоў. - Мінск : Полымя , 1992 .- 109, [3] с.

**Казлоў, Л. Р.** Картаграфія Беларусі падчас паўстання 1863-1864 гг. / Л. Р. Казлоў. - Мінск, 2003. - [16] с.

**Казлоў, Л. Р.** Картаграфія Беларусі падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі / Л. Р. Казлоў. - Мінск : [б. в.], 2004. - 15, [2] с.

**Казлоў, Л. Р.** Картаграфічныя крыніцы да гісторыі і гістарычнай геаграфіі Беларусі XIX ст. / Л. Р. Казлоў // Теоретические и практические проблемы документоведения и архивоведения: ретроспектива и современность : материалы Международной научно-практической конференции (Минск, 2-3 декабря 2015 г.) / [редколлегия : Э. М. Савицкий и др.]. - Минск, 2016. - С. 121-127.

**Казлоў, Л. Р.** Картаграфічныя крыніцы па гісторыі Беларусі XIX ст. / Л. Р. Казлоў // Проблемы методологии исследований истории Беларуси : материалы Международной научной конференции (Минск, 26-27 октября 2006 года ) / [редколлегия: А. А. Коваленя (ответственный редактор) и др.]. - Минск, 2008. - С. 246-249.

**Казлоў, Л. Р.** Карэліцкі край на старажытных картах (XVI—XIX ст.) / Л. Р. Казлоў. - Мінск : Арты-Фэкс, 2008. - 9, [3] с.

**Казлоў, Л. Р.** Мікалай Радзівіл Сіротка - падарожнік / Леў Казлоў // Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя даследаванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый : матэрыялы 1-й міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Нясвіж, 20 кастрычніка 2009 г. - Нясвіж, 2010. - С. 63-80.

**Казлоў, Л. Р.** Навагрудак на старажытных картах / [Л. Р. Казлоў]. – Мінск : Арты-Фэкс, 2002. – [2] с. – (Гарады і мястэчкі Беларусі ў старажытнай картаграфіі).

**Казлоў, Л. Р.** Падарожжы Мікалая Радзівіла «Сіроткі» / Л. Р. Казлоў. - Нясвіж : [б. в.], 2009. - 32 с.

**Казлоў, Л. Р.** Паміж горадам і вёскай : (картаграфічныя крыніцы да гісторыі мястэчак Гарадзеншчыны ў XIX - пачатку XX ст.) / Л. Р. Казлоў // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі,

эканомікі, культуры : зборнік навуковых артыкулаў. - Гродна, 2007. - С. 56-60.

**Казлоў, Л. Р**. Польска-савецкая мяжа Менскай акругі БССР (1924—1930 гг.) / Леў Казлоў // Знакамітыя мінчане XIX—XX стст. Мінск і Міншчына пасля падзей 1921 года — лёсы людзей і краіны : матэрыялы X Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, Мінск, 13—14 верасня 2016 г. / [рэдкалегія: В. Вялікі, З. Вінніцкі (навуковыя рэдактары) і інш.]. — Мінск, 2017. — С. 6—9.

**Казлоў, Л. Р**. Стагоддзі на картах / Леў Казлоў. - Мінск : Беларуская навука, 2021. - 239 с. : іл., каляр. іл., партр., карты.

**Казлоў, Л. Р.** Старажытная картаграфія Беларусі : [Карты] : атлас: [у 3 вып.] / Л. Р. Казлоў. - Мінск : Арты-Фэкс, 2005-2009. - (Старажытная картаграфія Беларусі).

**Козлов, Л. Р**. Белорусское Полесье на старинных картах / Л. Р. Козлов. – Москва : [б. и.], 2008. – 22, [2] с.

**Козлов, Л. Р**. Большой музей остроумия : исторические анекдоты / Л. Р. Козлов. – Минск : Арти-Фекс, 1999. – 619 с.

**Козлов, Л. Р.** Вспомогательные исторические дисциплины : учебно-методическое пособие / Л. Р. Козлов. – Минск : Минский désинститут им. А. М. Горького, 1980. – 90 с.

**Козлов, Л. Р.** Георг Кристоф Лихтенберг / авт.-сост. Л. Р. Козлов. – Минск : Арти-Фекс, 2002. – 94 с., [20] л. ил. – (Библиотека остроумия ; т. 47).

**Козлов, Л. Р.** Музей остроумия / Лев Романович Козлов. - Минск : Полымя, 1983. - 222 с. : ил.

**Козлов, Л. Р.** Представьте себе : [сборник] / авт.-сост. Л. Р. Козлов. – Минск : Арти-Фекс, 2001. – 172 с. – (Библиотека остроумия ; вып. 1).

**Козлов, Л. Р.** Радзивилл «Сиротка» : историческая трилогия : Кн. 1 : Наследник по мечу / Л. Р. Козлов. – Минск : Альтиора – Живые краски, 2015. – 183 с.

**Козлов, Л. Р.** Рост культурно-технического уровня рабочего класса Белоруссии в годы первой пятилетки (19281932 гг.) : автореферат диссертации ... кандидата исторических наук / Л. Р. Козлов. – Минск, 1969. – 22 с.

**Памяць. Кобрынскі раён** : гісторыка-дакументальная хроніка / рэдактар-укладальнік Л. Р. Казлоў. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 624 с. : іл.

**Плиско, Н. М.** Кобрин : историко-экономический очерк / Н. М. Плиско, Л. Р. Козлов. – Минск : «Полымя», 1987. – 95 с.

**Земля** силы Беловежская пуща = Зямля сілы Белавежская пушча : [фотаальбом]. – Мінск : «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», 2009.

У фотаальбоме выкарыстаны гістарычныя карты Л. Р. Казлова.

**Казлоў, Л. Р.** Паўночная вайна на Беларусі / Л. Р. Казлоў // Падарожнік. – 1998. - №№ 1-8. – С. 29–31.

***Аб жыцці і дзейнасці Л. Р. Казлова***

**Казлоў Леў Раманавіч** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. - С. 10-11.

**Казлоў Леў Раманавіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 262.

**Казлоў Леў Раманавіч** // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. - 2-е выд. - Мінск, 2007. - Т. 2. - С. 15.

**Козлов Лев Романович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2-х кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 488.

**Козлов Лев Романович** // Кто есть кто в Республике Беларусь. Люди дела. - Минск, 1999. - С. 65.

**Казлоў Леў Раманавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 436. – (Імі ганарацца землякі).

**Корзенко, Г. В**. Козлов Лев Романович / Г. В. Корзенко // Историки Беларуси в начале XXI столетия : библиографический справочник / Г. В. Корзенко. – Минск, 2007. – С. 173-174.

**Козлов Лев Романович** // Институт истории НАН Беларуси в лицах, 1929-2008 гг. : биобиблиографический справочник / Г. В. Корзенко [и др.]. – Минск, 2008. – С. 198.

**Казлоў Леў Раманавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук. – Кобрын, 2020. – С. 57-59 : фат.

**85 гадоў з дня нараджэння Л. Р. Казлова** (1938) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2020-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. - С. 86.

**Дзядзюля, А.** Захапляльны свет картаграфіі / Алена Дзядзюля // Звязда. – 2023. – 23 мая (№ 96). – С. 12.

У Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна праходзіць выстаўка «Мастацтва старажытнай картаграфіі» Л. Казлова.

**Ратуемся** спадчынай // Краязнаўчая газета. – 2023. – Май (№ 20). – С. 2.

17 мая ў Мінскай абласной бібліятэцы адкрылася выстава «Мастацтва старажытнай картаграфіі» Л. Казлова.

**Святлова, Н**. Майстэрства адлюстравання свету / Наталля Святлова ; фота аўтара // Літаратура і мастацтва. – 2023. – 26 мая (№ 21). – С. 14 : фат.

Плён апантанай працы па зборы старажытных карт Л. Казлова ўвасобіўся ў выстаўцы «Мастацтва старажытнай картаграфіі».

**Бакун, А.** Вандроўкі з земляком-картографом / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. - 26 верасня. - С. 5.

Пра Л. Р. Казлова, картографа, гісторыка і літаратара.

**Бакун, А.** Вывучаць мінулае, каб будаваць будучыню / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. - 31 кастрычніка. – С. 8.

Пра сустрэчу ў Кобрынскай раённай бібліятэцы з гісторыкам, картографам Л. Р. Казловым у юбілейны год.

**Декола, Н.** Белорусский Меркатор : минчанин Лев Козлов воссоздает раритетные карты / Надежда Декола // Советская Белоруссия. - 2018. - 7 июля (№ 128). - С. 11.

**Марчук, Н.** Литвинки и Литвиново : взгляд сквозь годы : [история д. Литвинки Кобринского района, 1563–2015 гг.; фото] / Нина Марчук // Кобрин-информ. - 2015. - 19 ноября (№ 47). - С. 5.

**Лыскавец, Я.** Старажытная карта – дакладны летапіс / Яраслаў Лыскавец // Звязда. – 2014. - 9 снежня. – С. 6.

Гутарка карэспандэнтаў «Звязды» з гісторыкам, пісьменнікам і картографам Л. Р. Казловым пра гісторыю Беларусі праз прызму картаграфіі.

**Белохвостик, Н**. Историческому музею подарили первую карту ВКЛ / Надежда Белохвостик // Комсомольская правда. – 2012. – 1 декабря. – С. 3.

Белорусский картограф Лев Козлов – о подлинности старинной карты.

**Сарычев, В.** Школа моей мамы / Василий Сарычев // Вечерний Брест. – 2010. – 10 ноября. – С. 1-2. – (Вечёрочка).

Из стен СШ № 1 г. Кобрина вышли многие учёные, среди которых и историк Лев Козлов.

**Козлов, Л. Р.** «Белорусские земли на картах мира были ещё при Птолемее» / [Л. Р. Козлов ; беседовала] Надежда Белохвостик // Комсомольская правда. - 2009. – 26 февраля - 4 марта. – С. 15.

Известный белорусский ученый, картограф, писатель, художник Лев Козлов картами занимается всю свою жизнь.

**Івуць, Г.** Глобус для Радзівілаўскага замка / Галіна Івуць // Голас Радзімы. - 2008. - 11 студзеня.

Пленным быў мінулы год для беларускага картографа Льва Казлова.

**Казлоў, Л.** «Кнігі робяцца з кніг, а карты – з карт» / [Леў Казлоў ; гутарыла] Наталля Кірпічэнкава // Культура. – 2007. – 4-10 жніўня. – С. 1.

**Казлоў, Л.** Падсумоўваючы здабыткі 2005 года / Леў Казлоў // ЛіМ. - 2006. - 12 студзеня. – С. 5.

Аўтар адказвае на пытанне, чым быў для яго знамянальны 2005 год.

**Казлоў Леў Раманавіч** // Краязнаўчая газета. – 2005. - № 25 (чэрвень).

**Сучасныя** беларускія краязнаўцы // Краязнаўчая газета. - 2005. - № 25. - С. 2.

Сярод іншых - Казлоў Леў Раманавіч.

**Дрык, Л.** «Старажытная карта - дасканалая гістарычная крыніца» / Людміла Дрык // Туризм и отдых. – 2004. - 9 декабря (№ 49).

2 снежня ў лекцыйнай зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося адкрыццё выставы «Беларусь на старажытных картах» і прэзентацыя кнігі Льва Казлова «Беларусь у працах польскіх картографаў XVI - пачатку XX ст.».

**Васильев, М.** Петр Климук, Василий Ласкович и другие / Михаил Васильев // Заря. – 1997. – 16 декабря.

Четвертый том «Энциклопедии истории Беларуси» включает информацию о наших земляках, в т. ч. о специалисте в области отечественной исторической географии и картографии Л. Р. Козлове.

**Казлоў, Л. Р.** Дзе тыя рачулкі, дзе тая мяжа / [Л. Р. Казлоў ; размаўляла] Таццяна Снітко // Звязда. - 1996. - 10 лютага. - С. 7.

Галоўны рэдактар і прэзідэнт «Арты-Фэкса» Леў Казлоў аб выхадзе ў свет «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі» і інш.

Кобрынскі раён
Кобрын
Літвінкі
Ліцвінкі
Казлоў Леў Раманавіч
Вучоныя
Гісторыкі
Картографы
Краязнаўцы